Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 22 Мая 1915 г. № 19—20

## Яшчэ адна вайна.

У той кароткі час, які прайшоў між апошнім нумэрам «Нашае Нівы» і сягоняшнім, узнялася йшчэ адна вайна на сьвеці. Гэта—вайна між Італіей і Аўстрыей.

Даўно ўжо чакалі гэтай вайны: ешчэ ў самым пачатку вялікай эўропэйскай вайны, калі толькі Аўстрыя і Нямеччына выступілі супроць чуць не ўсіх вялікіх дзержаў, хаўрусніца іх Італія адмовілася памагчы ім. Але гэтаго йшчэ мала. Паводлуг хаўрусніцкай умовы між Аўстрыей і Італіей, у прыпадку, калі Аўстрыя пашырыць сваю дзержаву коштам якой-небудзь балканскай дзержавы, Італія мае права вымагаць ад Аўстрыі адплаты. Вось, як аўстрыйскае войска ўступіло ў межы Сэрбіі, Італія і прыпомніла сваім хаўрусьнікам той пункт умовы. На гэта Аўстрыя атказала, што яна будзе гаварыць аб адплаце італьянцам, як скончыцца вайна, бо німа ведама, які будзе канец гэтай вайны і ці папраўдзі аўстрыяцкая дзержава будзе пашырэна.—Італія стаяла пры сваей думцы і жадала, каб Аўстрыя аддала ей часць сваіх зямель: Тріэнскую правінцію, горад Тріэст і часць берагу Адрыатыцкаго мора—ў Далмаціі, дзе жывуць славянскіе племёны. Пачаўся як-бы торг. Пасрэднікам была Нямеччына. Але з гэтаго пасрэдніцтва нічога ня выйшла, бо дзержавы, што ваююць з Аўстрыей і Нямеччынай: Расея, Англія і Францыя,—пасулілі Італіі бяз споркі аддаць тые аўстрыяцкіе землі, каторых яна дамагаецца, ведама, калі Аўстрыю зваююць. Што ешчэ пасулілі італьянцам, німа ведама: мы тутака апісываем адно тое, што італьянскі урад офіціальна апублікаваў у так званай «Зялёнай кнізе». А з усяго гэтаго быў такі канец, што *Італія аб'явіла вайну Аўстрыі*.

Вайна ўжо пачалася. Італьянскае войска наступае на сумежные з Італіей аўстрыйскіе правінціі. Але грунт тамака дужа гарысты, кожын крок упярод каштуе многа ахвяр, і нельга чэкаць скораго канца гэтай новай вайны. Змагэньне йдзе і на моры: з абодвых бакоў ёсьць і тут ахвяры — аўстрыйцы затапілі італьянскі міноносец, італьянцы—аўстрыйскую падводную лодку, дый німа дня, каб не было марской бітвы—меншай чы вялікшай. Трэба думаць, што вайна між Аўстрыей і Італіей на моры будзе, бадай, больш крывавая, чым на зямлі: Італія хочэ зусім запанаваць на Адрыатыцкім моры, каторае амывае берагі абедзьвых ваюючых дзержаў, і дзеля гэтаго будзе старацца, як мага, знішчожыць марскую сілу Аўстрыі—яе ваенны флот.

Нямеччына йдзе поруч з Аўстрыей і дае ей сваю падмогу. Так сама хочэ памагчы ей і Турэччына. Туркі паднялі паўстаньне у італьянскай калоніі ў Афрыцы—Трыполі, што даўней належала да туркоў і яе Італія колькі год таму назад адваевала. — За тое Італіі памагаюць Расея, Англія і Францыя, с каторымі італьянская дзержава звязала сваю долю.

**А.**

## На вайне і каля вайны.

**Немцы пад Лібавай.** У міністэрства дарог прышла вестка аб працы немцаў па уладжэньню жалезнадарожнай лініі, злучаючай Лібаву з Мэмэлям. Дарога ладзіцца амаль не па самаму берагу Балтыцкаго мора. Кірунак гэты карысьцен дзеля таго, што з аднаго боку тут ёсьць пясок, патрэбны для пастройкі, а с другога,—самы берэг даволі роўны і ня трэба раўнаваць зямлю. На тысячы грузавых аўтамабілях на узбярэжжэ дастаўлены з Нямеччыны работнікі, а так сама і ўвесь жалезнадарожны матэрыял ужо гатовы і сабраны. Думаюць, што сярод дастаўленых сюды работнікоў ёсьць шмат бэльгійцоў с занятых немцамі мейсц на заходнім фронці. Пастройка лініі вядзецца амаль не зразу па ўсей лініі паміж Лібавай і Мэмэлям і, гэткім парадкам, рух па гэтай лініі можэ быць адкрыты вельмі хутка. Сьпешнасьць пастройкі лініі тлумачыцца у міністэрстві жаданьнем нямецкіх уласцей вывезці у Нямеччыну з Лібавы і с прылегаючай к ей лініі на Ромны ўсе вагоны і жалезнадарожные прылады.

**Плата грошы за рэквізаваные павозкі і коней.** Віленскае Сельска-гаспадарскае Таварыство звярнулося да глаўнаго начальніка двінскаго ваеннаго округа са старэньнем, каб хутчэй былі выплачэны грошы селянам за рэквізованых у верэсьні 1914 г. коней і павозкі.

Цяпер канцэлярыя глаўнаго начальніка двінскаго ваеннаго округа паведаміла віленскае сельска-гаспадарскае таварыство, што старэньне яго здавольнено і што гэтымі днямі прыступюць да выплаты селянам грошы.

**Уцекачы з Галіччыны.** У Кіеў прыбываюць уцекачы з Галіччыны, найболей старые і дзеці. Уцекачы пакідалі маетнасць і дужа беднічаюць. Большасьць у падзертай адзежы, бяз грошы. Апеку над уцекачамі узялі на сябе грамадзянскіе установы.

**Высылка у Енісейскую губэрню.** Па загаду глаўнаго начальніка здаволеньня патрэб армій паўночна-заходнаго фронту,

, купцы 2 гільдіі Мечыслаў Кліманчык і Аўгён Войтарскій, за паманку дарогай подкупа скланіць чыноўную асобу на падлог, высылаюцца у Енісейскую губэрню.

**Газэта для паланёнікоў.** Адна нямецкая газэта пішэ, што колькі тыднёў таму выйшоў першы нумэр газэты для палоненых французоў-салдатоў, якіх трымаюць немцы у абозе каля Ордроф. Выдавец газэты—прыватны прэдпрыемец, рэдактар—камэндант тамэчнай крэпасьці.

## ВАЙНА.

Апошніе весткі ад Штабу Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго такіе:

17 мая. У Шавэльскім окрузе непрыяцель атступіўшый с пазыціі каля Бубье, 14 мая вёў бой на фронце Куртовяны—Побудісе. 15 мая нашэ войско заваладзело непрыяцельскімі пазыціямі на гэтым фнонце, прычым немцы, выбітые з гарэўшаго мястэчка Куртовяны, атступаюць у поўным безладзьдзі, ціснутые намі. На ніжней Дубісе нанады непрыяцеля, пачаўшыеся 14 мая, на другі дзень ушчуклі.

14 мая непрыяцель пусціў па аколіцы Асаўца крэпкі гарматны агонь, не прычыніўшый крэпасці шкоды.

У заядлым бою на Сане, паміж Сенявай і Перамышлям, праз увесь дзень 15 мая выдатных перамен не было. Нашэ войска вяло проці-нанады на рэцэ Любачоўцы, а такжэ на фронце паселішч Тухла—Кальнікуф — Накло—Барыч, пры гэтым многа якіе сялібы перэхадзілі з рук у рукі. Непрыяцельскіе нанады падгатаўляліся абстрэліваньнем нашых пазыцій прыладамі з удушлівым газам.

Вялікі лік паланённых і перабежчыкоў з часці арміі генерала Макензэна у адзін голас кажуць, што страты непрыяцеля вельмі вялікі.

Паміж Перамышлям і вялікім Днестроўскім балотам намі адбіты 14 мая тры непрыяцельскіе нанады на ўсход ад Гуссакова, прычым немцы у гэты дзень дахадзілі да нашых драцяных загародак ды, пасьля вялікіх страт, не утрымаліся і адыйшлі у мейсцо выхаду свайго.

На Заднестроўскім фронце 14 і 15 мая бітва ішла з вялікай заўзятасцю. Вялікіе грамады непрыяцеля заўзята, ня лічучыся са стратамі, ішлі на прыступ нашых пазыцій ад вялікаго Днестроўскаго балота, да Даліны. Усе нападкі намі адбіты. Кіруючыся вырваць ініцьятыву з рук праціўніка, нашэ войска перайшло у наступленьне на левым берэзі рэкі Сьвіцы і на ўсім фронці рэкі Ломніцы.

Каля Перэдзінско наступленьне развіваецца вельмі карысна, і за ноч на 15 мая намі захоплена тут больш 3.200 паланённікоў, 72 афіцэры, знамя аднаго з гонвэдных палкоў і некалькі кулемётоў.

20 мая. У Шавэльскай акрузе без выдатных перамен. На захад ад сялібы Куртовяны бітва цягнецца далей на фронце Траўляны Гай—Лішкі, прычым 18 мая мы заваладзелі пасьля штыкавой бітвы гэнай апошняй сялібай, сільна умацаванай і заўзята абароненай немцамі.

На левым берэзі Віслы непрыяцель у ноч на 18 мая развіў вельмі крэпкі гарматны агонь на усім фронце на поўнач ад Пiліцы.

Каля чатырох гадзін раніцы непрыяцель, устроіўшы дымавые заслоны і, шырока карыстаючы атрутным чадам, нападаў не малымі сіламі на нашы пазыціі на Бзуры і Бітковіцы, Брохова, Сохачова і Козлова, а асабліва заўзята на ніжняй Раўцы, на участку між вёскамі Мізэрка і Воля—Шыдлоўская.

Ня глядзя на вялікі лік патрачэнаго непрыяцелям атрутнаго чаду, пах катораго чуваць было нават у 30 верстах ззаду за нашым фронтам, усе нанады ворага былі адбіты.

У Галіччыне вораг, нарыхтаваўшыся у папярэдніе дні, пусьціў заўзяты агонь і рад нападоў проці заходнага і паўночнаго фронтоў Перамышля, паміж лініямі фортоў № 7 і да № 11.

Праз ноч на 18 мая непрыяцелю удалося прыблізіцца на 200 крокоў да некаторых з нападаных ім участкоў і нават ўварвацца у форт № 7, каля катораго вынік заўзяты бой, цягнуўшыйся да 2 гадзіны дня, 18 мая, калі непрыяцель з грамадными стратамі быў аткінут ад форту. Рэшткі уварваўшыхся у 7 форт ў ліку 23 афіцэроў і 600 ніжніх чыноў ўзяты намі ў палон.

На Заднестроўскім фронце непрыяцель, складаючыйся глаўным чынам з немцоў, пусціў у бой сваю рэзэрву у блізкай да Стрыю аколіцы, дзе вынік бітвы ешчэ не устаноўлен.

На рэцэ Свіцы, нашаму войску далей прыяло. Тут за час ад 16 па 17 мая лік узятых намі палонных, зарэгістраваныя пры перэдаваньню ў тыл, 10,422 ніжніх чыны і 238 афіцэроў.

**На Каўказкым і Захаднім (францускім) фронтах** нічога выдатнаго за гэты час не здарылося.

## Крывавая летапісь.

Крывавымі літэрамі пішэцца летапісь вайны. Жудасные вобразы гуртоўных убіўстоў і непрытомных праяў дзікасьці—малюнкі к ёй. Перэварачуеш страніцы гісторыі цяперачыны, і халодны жах напаўняе душу: куды зайшло чэлавечэства з высокай культурай, з яго вялікімі, адвечнымі ідэаламі? Ці-ж усё гэта—пусты голас? Ці-ж тое, у што верылі мільёны людзей, аказалося толькі ня кемкім жаданьнем ідэалістоў?

Вось якіе думкі, выклікаюцца цяперашнімі здарэньнямі. Думкі цяжкіе, прыгнетаючые, забіраючые веру у лепшые часткі чэлавечай натуры.

Можэ быць, гэтые думкі суб'ектыўна аснованы. З таго, што цяпер робіцца на нашых вачах, інакш думаць нельга. Але ўсё-ж такі мы маем адну пацеху, якая паможыць нам верыць у ідэал, у чэлавека.

Гэта—лекціі мінуўшчыны.

сталася сэймовым горадам. Аўгуст III пабудаваў сэймовы будынак у Горадні. У гэтым гмаху быў сэнатарскі палац, краёвые рады і каралеўскіе канцэлярыі. У 1775 гаду у Горадню быў пераведзен галоўны суд, так званы Трыбунал і грашавая камісія, ці бач нешта кшталтам міністэрства фінансоў. У гэтым часе падскарбі Вялікаго Княз. Літоўскаго Тызэнгаўз галажыў у Горадні ткацкіе і другіе фабрыкі, усяго каля 15, а такжэ вэтэрынарную школу, мэдыцынскую, акушэрскую, хірургічную а пры школах багатую біблiотэку і ешчэ багацейшы батанічны сад. Тызэнгаўз хацеў аткрыць у Горадні Акадэмію Навук і было да гэтаго усё ужо прыгатавана, але не збылося дзеля пастаронных прычын.

А тым часам прыйшоў час раздзелу Польшы і Горадня досталася Расеі у 1793 гаду, актам зацьверджэным у Горадні на сэйме.

Цяпер Горадня — гэта места губэрнскае, а прытым, як надпагранічнае—умацаванае крэпасьцю і мае значэньне у разыгрваючайся на нашых вачах вайне. Горадня ляжыць на правым берэзі Нёмана і па абодвых берагох Гарадніčанкі. Усяго жыхароў у Горадні 41,896; праз Горадню праходзіць чыгунка Петроградзка-Варшаўская. Жыхары па нацыі дзелюцца на беларусоў, расейцоў, палякоў і жыдоў. Добрые 8/10 цяперэшніх Горадзенскіх палякоў і расейцоў гэта апалячэные і абрасеіўшыеся беларусы, каторые, як зазвычай усякіе перакінчыкі, у восем разоў большые ворагі беларускаго адраджэньня за самых найпраўдзіўшых палякоў і расейцоў. На блізка палавіну жыхароў Горадні складаюцца жыды каторые, ад сьвята дома і дзеля фанабэрыі у людзях, гаворуць па расейску і прыдаюць Горадні расейскі полер. Сам жэ фундамэнт Горадні і аколіцы яго заселены беларусамі, як і тысячу гадоў таму назад.

**Ю. В.**

---

## Беларускае Таварыство па аказаньню помачы пацярпеўшым ад вайны.

Дня 12-го мая адбыўся устаноўчы сход «Беларускаго Таварыства па аказаньню помачы пацярпеўшым ад вайны». На маршалка Сходу выбран быў аднаголасна прафэсар Ігнатоўскі з Мінска. Пасля выбароў маршалка, п. Алексюк сказаў прамову, у каторай адмеціў насьпеўшую патрэбу Таварыства, бо сам ён пабываў у тых мейсцох гродзенскай губэрні, каторые кранула вайна, і бачыў руіну, учыненую беларусам-сялянам ваеннай навалай; бачыў бяду і злыбеду жыхароў і пажарышчы вёсак і сёл. Другіе прамоўцы, пацьверджаючы думку п. Алексюка аб насьпеўшай патрэбі нясьці дапамогу беларусам на мейсцох, дзе кранула ваенная руіна, адмечалі такжэ патрэбу, нясьці дапамогу і тым уцекачом, не беларусам, якіе і с польшчы і з літвы уцяклі у наш край, нясьці дапамогу усім, хто пацярпеў ад вайны, рашыўся куска хлеба, ложкі цёплай стравы і страхі над галавой, не зважаючы на тое якой ён нацыі і веры. Мы, беларусы, як гаспадары старонкі, павінны сустрэціць са славянскай гасціннасьцю сваіх зруйнаваных суседзёў-людзей на сваім парозі; але, апрача дапамогі уцекачом, Таварыство павінно паруціцца такжэ, паводле магчымасці, заспакаіваць семінные і емінные патрэбы жыхароў усяго нашаго краю.

Пасьля прамоў, у каторых высьніліся мэты Таварыства, прыступілі да выбороў Камітэту. У Камітэт выбраны аднагалосна: інжэнер В. Іваноўскі, А. Луцкевіч, Біндзюк, Алексюк, Ластоўскі, Столыгва, св. Савіцкій, кс. Грынкевіч і Буйніцкі; у кандыдаты Камітэту: І. Луцкевіч, Клім, Перэбілло. У рэвізійную камісію выбраны: Будзько, Мохов, Прозороў, Бонч-Осмолоўскі, Радкевіч, Русецкі.

Дня 13 мая адбылося першае заседаньне Камітэту, на каторым выбіралі чыноў Камітэту. На маршалка выбран В. Іваноўскі, на намесьнікоў яго — А. Луцкевіч і В. Ластоўскі, на сэкрэтароў—П. Алексюк і Біндзюк; на скарбніка—В. Столыгва.

Пасьля выбороў абмярковываліся пытаньнямі, па аказаньню дамапогі пацярпеўшым ад вайны.

**Сябрук.**

---

## КАМІТЭТ

**Беларускаго Таварыства па аказаньню помачы пацярпеўшым ад вайны.**

*Браты-Беларусы!*

Ваенная руіна кранула і наш край — Беларускі. Тысячы сямей асталіся без прытулку, адзежы і ежы! Каб заспакоіць патрэбы гэтых бяздольных братоў нашых, мы заснавалі Камітэт у Вільні і звертаемся да Вас, Браты-Беларусы, с прозьбай, аказаць помач на емінные і семінные патрэбы.

Складайце складкі!

Прысылайце дапамогі у камітэт.

Часовы адрэс Камітэту: Вільня, Георгіевскій проспэкт «Бѣлорусское собраніе» у «Беларускі Камітэт па аказаньню помачы пацярпеўшым ад вайны».

---

# Пані Твардоуская.

**З рукапісу 1840-х гадоў, падпісанаго: Г. Арцімоўскі.**

Гайда, хлопцы! Гучна шпарка,
Музыкі, заграйце!
Гэй, шыркару! Гэй, шынкарка!
Гарэлкі давайце!..
Рэжуць скрыпкі і цымбалы,
Дзеўчаты танцуюць,
Хлопцы с п'яна не памалу,
Каля іх гарцуюць.
Пан Твардоўскі ў канцы столу
С пастаўца чыркае:
—«Гуляй, душа, тра-ля-ля-ля!»
К тахту падпевае,
Скруціў жыда, як гамана,
Вусы пакручае!
У бацьку, ў матку ён улана
І грамаду лае,—
Памкуўся улан, ён ўздоўж ёга
Шаблюкаю сьвіснуў,
Улан-цю-цю! го-га, го-га!
Зайцам у лес пырснуў!
Ўзяў на бакір пісар шапку,
І грашмі забразгаў,
Аж наш пісар, верць, ў сабаку!
І на ўсіх загаўкаў.
А шаўцу—то пан Твардоўскі
Добра ў знакі даўся,
Бо мабыць с «часок» маскоўскі
Барылай качаўся;
Ў нос уторкнуў яму дудкі,
З дудак, маўляў с кухі,
Б'юць пад стрэху цераз дудкі
Крыніцы сівухі,
Б'юць крыніцы, пан Твардоўскі
Кухаль падстаўляе,
Аж, зірк, на дно, што у беса?
Уюн на дне гуляе.
Дух-сьвяты, грамада з вамі!
Патарашчце-ж банькі!
Уюн уцёк; казёл з рагамі
Вынырнуў са шклянкі!
Бэкнуў, як чартоў радзімец,
Пагуляў кудлаты,
Скочыў ў комін; тут, зірк, немец
Стаіць сярод хаты.
Нос карчочкам, лыч сьвінячы,
Карк шарсціньню крыты,
Кур'і ножкі, хвост сабачы,
Рожкі стоцьма ўбіты.
Круць нагамі, верць вачамі, —
У пояс пакланіўся:
—«Ну, Твардоўскі! час каб з намі
«Ты ўжо разлічыўся!
«Нагуляўся, навярэдзіў, —
«Усяго паспытаўся:
«Дзеўчат дражніў, кабет зводзіў,
«Мужом ў знакі даўся.
«Нагрэў ты і мне чупрыну,
«Як сам здароў знаеш,
«Акульбачыў як скаціну, —
«Лішэк вымагаеш.
«Што цяпер, Твардоўскі, будзе,
«Аб тым ў пеклі знаюць,
«Бо карчму, во, гэту людзі
«Рымам» называюць!
«Годзі мудрыць табе з намі».
«Слова — не палова!
«Помніш, пане, як між намі
«Станула умова?
«Лыса гора, брытва, пальцы,
«Паперы поўкарты...
«Гайда ў пекла скваярэць ў шмальцы,

---

хоць, праўда, сядзеў найболі каля навязанаго сіўчыка у саду.

А ў панядзелак, рана-параненьку, недалёчка ат земскай бальніцы, у ліпняку, каля доміка фэльчэра, ужо стаяў с калёсамі нагадаваны за нач сіўчык, топаў капытом, махаў галавою і сьцёбаў па бакох хвастом.

Калёсы былі ізноў толькі што падмазаны, і с каткоў капаў на зямлю бруштыновымі каплямі дзёгаць. Ён мешаўся с пылам і даваў прыемны водар,—ат катораго у такое прыгожае вясеньнае раньня, у халадку пад ліпкамі ды й каля кветак у садочку, была спакойнавесяло, па-вясковаму ціхамірна, хораша.

На калёсах была разаслана гунька, лежала пярына, лежаў мужчынскі жупан, пад ім — атава і бізун.

Юлічка атклaнівалася с цёценькай і з дзядзенькай. На дарогу цётка пасадзіла яе яшчэ раз і прымусіла выпіць шклянку малака і зьесьці піражок.

Юлічка была невясёла, піла і ела без усякаго смаку, ня хочучы. Пад ложэчкаю у яе так шчымело і млело перад ат'ездам.

Два райскіх тыдні праляцелі і німа ўжо іх. У галаве сядзеў той бульвар.. Яна яшчэ хадзіла па гуляньню, чула яшчэ любоўные слоўцы Пеці Міровіча... І неслася сэрцэм да такога жыцьця, гдзе яна была гімназістка як гімназістка, ня мела ніякаго апрыч пераэкзаміноўкі, клопату, гуляла ды ня чула, як сварыцца матка з бацькам і пачала забывацца на маткіны папеканьня за панства, што позна сьпіць, ня хочэ сьвіньням замешаць... А яна і рада-б чым матцы прыслужыцца, памагчы, дык калі-ж у іх ў домі павялася такая нячыстата, матка й бацька радзіліся у такой нячыстаце, прывыклі к ёй, не замечаюць яе і вінавацюць Юлю, што яна сядзіць на іхнім гарбу нічога ня робіць, цягніцца за падругамі багатыркамі і ня любіць бацькоў, стыдзіцца іх, што яны простые людзі. А Юлі душна, яна затохніцца у таком жыцьці... Не вялікая штука замешаць сьвіньням; можна ня голаю рукою, як матка, а мяшулкаю, ды калі-ж... Ай, што там, тошна й тольна...

— Еж, еж, Юлічка. Скаштуй, дзетка, яшчэ во асушачку.

— Дзякую, цёця; дужа дзякую..

Пан Пухальскі выйшоў к сіўчыку і увідзіў, што у ліпняку на лавачцы сідзяць у трох хлапцы-вучні с пукамі кветак.

Калі стары прырухтаваў каня, толькі ехаць — падыйшоў пухлы с прышчынкамі на падбародку хлапец і, нюхаючы букет з незабудак, пачаў пытацца:

— Ня ўжо гэта падвода, што за паннай Пухальскай прыслалі?

Пухальскі усьміхнуўся: шляхціцу ветласць ўсягды падабалася.

— Ага, га, гэта падвода, панічок. А ці й вам куды ехаць?

— Не, я так сабе. Хацеў панну Юлю убачыць.

Хлапцы падыйшлі да ганак.

З дому пачуўся тупат, і выйшла Юлічка з вузялком і цётка з нейкімі пакуначкамі.

Дзяўчына зірнула і жарка пачырванела. А хлапцы ветліва пакланіліся, пацалавалі у руку цётцы, а потым і Юлі і падалі ёй кветкі.

Пухальскі не спадзеваўся на такі фасон.

— Выбачайце, панна Юля, мы хацелі зрабіць сюрпрыз. Падыйшлі, глядзім: падвода.

— Ну з Богам, маё дзетка, садзіся,—пацалавалася цётка.

Хлапцы узяліся падсаджываць Юлічку, але тая неяк, ня гледзючы па бокох, скокнула на калёсы па хлапецку, не стаўшы на каток, падкомкала пярыну, абгарнулася хвусткаю, утупілася і без радасьці казала:

— Нічога, нічога... Дзякую. Бывайце. Ай, нічога...

Сіўчык дрыгнуў, Юлічка атхіснулася назад — паехалі.

Пішы, Юлічка, — і цётка, пастаяўшы, схавалася за дзьвярмі.

Вучні яшчэ ішлі па бакох.

Міровіч, падсаджваючы Юлю, наступіў на дзёгаць, што накапало, і цяпер незаметна дрыгаў нагою, каб аткасацца ад яго, але ён ладна прыліп да новаго бацінка і ўсё болей набіраў пылу. Хлопец згубіў добры настрой.

— А мы-б і не зналі, дык падводчык ваш нам сказаў, што 'йто за вамі...

— Пішыце, панна Юля, як пойдзіць час у фальварку...

— Да пабачэньня!

— Бывайце!.. «А ну ж яе саўсім, знаць ня выспалася», —сярдаваў Міровіч, скрыўджэны дзёгцям і непрыхільнасьцю дзяўчыны у самы ат'езд: — йшчэ можэ падводчык — яе бацька; іш, утупілася...»

Букетаў яна у рукі не ўзяла, і яны недалужненька лежалі на бацькавым жупане.

Вучні асталіся.

Пухальскі маўчаў і сапеў: думаў. Алі ткі усьміхнуўся пад вусы:

— Ці мякка сядзець, вяльможная паненка?

— Мякка... — і кінула косым вокам на бацьку: «Шляхцюк нешчасны»—прашэпаціла дзяўчына. «Ах, зачым я на сьвет нарадзілася?» — гудзеў у вушах учэрашні бульварны матыў, а галаву распіралі пакутные думкі.

Сонцэ паднімалося. Сіўчык матаў галавою і пыліў нагамі. Пыл і дзёгаць давалі прыемны дарожны пах.

Места блішчэло атзадзі, а у-перадзі і з бакоў цягнулося шырока-далёкае мэлянхалічнае поле. На небазводзі сінеў лес.

Жауранак купаўся ў нябеснай вісаце і цюрлюрлюкаў сваю песьню.

Падвода пыліла...

**М. Горэцкі.**

12/IV—1915 г.

«Годзі строіць жарты!..»
Бач, чарцёнак як падлюка
Хітра ўмудраваўся?
«Рым»—карчма?! чартоўска штука!
Твардоўскі азваўся:
—«Што ж, пайду у пекла праўдзі
«Калі ўмова служэ;
«Але й ты рабі па праўдзі
«Дый не чванься дужа.
«Глянь у контракт твой са мною,
«Яка там умова?—
«Йшчэ тры штукі за табою,—
«Зробіш,—ні паў слова!..
«Вот вісіць панад дзьверамі
«Зростам мабыць с цапа *)
«Прад тваймі якраз вачамі
«Малявана шкапа;
«Ніхай шкапа падамною
«Жерабцом гарцуе,
«Ніхай круціць галавою
«Скачэ і бушуе;
«Возьмеш ешчэ пяску жменю
«С пад старэчай хаты,
«Спляцеш с пяску, як з раменя
«Гарапнік трайчаты.
«Дый папасьвіць каня трэба,
«Стаць на адпачынак,
«То ўжо, глядзі, каб як з неба
«Ўрадзіўся будынак.
«Будынак з лупін арэхоў,
«Пастаў адным махам,
«І з барод жыдоўскіх стрэху,
«Цьвекавану макам.
«Во, гваздочак на пачынак—
«Локаць лічы ў доўжкі,—
«Па тры ў кожну ўбій з мачынак,
«А менш ані трошкі».

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Бес дасужы: сьвіснуў, ляснуў,
І конь ўжо бушуе;
Батог с пяску ў жмені хляснуў.
Твардоўскі сумуе.
«Лоўка зробіў! німа рады,
«Чорце, аглашоны!
«А цяпер, зажый купелі
«Ты з вады сьвячонай!»
—«Ой, сваточку, я у тэй лазьні
«З роду не купаўся!»
Скорчыўсь. зморшчыўсь, шабоўць, ў воду,
Дый назад падаўся.
—«Э, Твардоўскі, ізноў справу
«Выгралі чэрцякі?!»
—«Пачакайце, йшчэ на славу
«Утру ім табакі!
«Хто праграў, хто выграў справу
«То—як давядзепца!
—«Павярніся, глянь на лаву,
«Што табе здаецца?
«Цмокнісь з жонкаю маею,—
«Яна твая будзе,—
«(Як жыву на сьвеці з ею,
«Аб тым маўчаць людзі),
«Ніхай ксёндз вам рукі звяжэ...
«Трэці пункт умовы...»
—«Чуйця людзі, што чорт скажэ?
«Зважйце на словы!—
—«Будзь ты, чорце, ейным мужам,
«Астатня умова:
«Абы толькі жыў ў дружбе,
«Я тады ні слова!.,

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Тут ўжо чорту не да солі:
Хвосцікамківае,
Нос скапыліў на басолі
Да дзьвярэй шмыгае.
А Твардоўскі, цап, за кудлы:
—«Пачэкай ты, ўражэ!
«Як на ўцекі—то ты мудры,
«А што ўмова кажэ?»
—«Ой, пусьці, пусьці, Твардоўскі!
«Гвалт, ратуйце людзі!
«А не, — злаю па маскоўску,—
«Сорам слухаць будзе!»
І, тымчасам, верць, ў старонку
І с куточка хаты,
Ад ключа зглядзеўшы дзірку,
Уцёк вон праклятыя...
«Эй, лаві, лаві псяюху!»
Ўсе ўжо закрычалі;
А «псяюхі» ані духу—
Памінай як звалі!

. . . . . . . . . . . . . . . . .

«Жонка люба, годзі плакаць!
Твардоўскі азваўся, —
«Хацеў с чортам вас пасватаць,
Чорт, бач, атказаўся...»

*Паdaу у друк* **В. Л.**

———

*) цап—казёл скапец.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Вільня.** Віленскі губэрнатар, па упаўнамочэньню ад глаўнаго начальніка двінскаго ваеннаго Округа, выдаў абавязываючую пастанову, каторай забараняецца перэкапываць канавамі летніе дарогі, якіе ідуць ўдоўж і побач с шоссэ. Вінаватые у нарўшэньню гэтай пастановы, падпадаюць у адміністрацыўным парадку грашавому штрафу у ліку да 3,000 руб., або адседцы у турме ці крэпасці да 3-х месяцоў.

**Пост у жыдоў.** Віленскі рабінат назначыў на 20 мая агульны пост жыдом гор. Вільні і агульнае маленьня аб пасланьне пабеды расейскаму аружжу.

У гор. Бабруйску такі-ж пост і маленьне былі назначэны на 30 красавіка.

**Паварот „амэрыканцоў“.** У апошніе часы блізка штодзень прыбываюць з Амэрыкі, праз Фінляндзію і Архаргельск, парціі беларусоў-селян выехаўшых раней у Амэрыку шукаючы там працы. Вайна спыніла у Амэрыцы прамышленнасьць і праз гэта заработкі там ушчуклі.

## З Міншчыны.

**Абавязываючая пастанова.**

**Мінск.** Глаўны начальнік округа выдаў абявязываючую пастанову, каторай забараняецца закрываць крамы, якіе прадаюць харчы і пошыр, а такжэ адмаўляцца прадаваць жыхаром тые тавары па цэнах, установленых земскімі гарадзкімі установамі, скупляць харчы і пошыр у праезджых на дарогах і вуліцах і хаваць запасы.

**Наглые сьмерці.** У вёсцы Осава, докшыцкай воласьці атруціўся грыбамі-смаршчкамі хлопчык 7 гадкоў, Антось Мядзведзкі. Што год вясной бываюць гэткіе здарэньня атручэньня смарчкамі, а бываюць дзеля таго, што гэтые грыбы на слюзявіне сваей маюць атрутые жывучкі і дзеля гэтаго смаршчкі перад тым, як ужываць іх на яду, трэба добра, і па колькі разоў абварываць варам.

Каля Давід-Гарадка у рэцэ Горыні знайшлі труп хлопца Янкі Самсона 16 гадоў. Бацькі казалі што ён днём раней выйшо ў на заработкі, як і калі насцігла яго сьмертухна нет ведама.

У мястэчку Петрыкаве, Мозырскаго павету, гаспадар Якуб Грыневіч павёў на начлег коні, разлажыў агонь пад дубовым пнём і лёг спаць. калі ён спаў, пень падгарэў, зваліўся на яго і прыбіў да сьмерці.

У Мінску у слабадзе Міхалянка знайшлі у студні утопшую кабету, а каля студні знайшлі сачок нябошчыцы з грашамі 270 руб. і 79 к., пашпартам і дробнымі рэчамі. З гэтаго відаць што кабеціна сама сябе загубіла, а з якой прычыны нет ведама. Нябошчыца прыехала з Рыгі у Мінск. Найменьне яе Кенігсфест, 25 гадоў.

**Тайные браваркі.** У сасновым бару, Кадоўба, ігуменскаго павету паліція высачыла патайны бровар, каторы гнаў гарэлку ад 1 мая 1914 г. Акцыза вылічыла, што аднаго акцызнаго мыта з выгнанай браваркам гарэлкі трэ’ было-б спагнаць 30,423 рублі. Гарэлку прадавалі па 2 рублі кварту. Арэштаваны Іван і Ярмалай Знакі.

**За патайнае шынкарства.** У Бабруйску Рубіна Кавальчука яго жонку і сына пасадзілі на тры месяцы пад арэшт за патайнае шынкарства.

**Цьвярозасць.** Рэчыцкае земство чыніць старэньне, каб у межах гэтаго павету зачыніць на заўсёды усякіе шынкоўні.

**Пажары.** У вёсцы Ячнай, Столпецкай воласці пажар прычыніў страт на 4,380 р.

У вёсцы Дубой, Мінск. губ., згарэлі будоўлі 59 гаспадароў, страт на 24,300 руб.

У Вышэвічах згарэлі будоўлі 68 гаспадароў, страт на 44,193 рублі.

У вёсцы Пустошкі згарэлі будоўлі 10 гаспадароў, страт на 10,335 руб.

# З усіх старон.

**Земля ваенным.** Маскоўскае земскае сабраньне прызнало патрэбным цяпер распрацаваць праект закону, аб тым, каб вертаючыхся дамоў ваенных надзеляць зямлёй, канфіскаванай у падданых ваюючых цяпер з Расеяй дзержаў.

**Кара на сьмерць.** У Кацерынаслаўлі пакаралі на сьмерць Фішкіна, Клушына і Фадеева, засуджэных за разбой.

У Адэсі пакаралі на сьмерць селяніна Пагарэльчука за убіўства і грабежства; селяніна Пасычнея за згвалтаваньне і убіўство.

**Пажар.** У Архангельску згарэла лесапіловачная біржа, страт каля 300,000 руб.

**Высяленьне жыдоў с Коўны.** У «Літоўскай Русі» надрукавана: «Гэтымі днямі, як мы чулі, выйшоў загад ад вышэйшаго ваеннаго начальства, што у аколіцы крэпасці Коўны забаронена жыць жыдом, праз увесь час вайны з Нямеччынай. Гарадзкой паліціі, паводле тых-жэ чутак, дадзен загад сачыць за тым, каб усе жыды выселеные с Коўны, былі выкасаваны з дамовых кніжак і ніякім спосабам не зьяўляліся у Коўні, пакуль ня будзе дан стасоўны загад. У ковенскую крепасную тэрыторыю ўходзіць і паветовая акруга, дзе мабыць ня могуць жыць да канца вайны жыды.

**Новые змовіны проці султана.** У Константынопалі раскрылі новые змовіны проці Султана. У звязку з гэтым павешэны сэкрэтар Султана Назім бэй і два арабскіх шэйкі (духоўнікі).

**Амністыя у Італіі.** «Руск. Вѣд» паведамляюць, што італьянскі караль выдаў політычную амністыю.

**Бунт у Трыесці.** У партовым аўстрыяцкім горадзе Трыесце быў бунт, да катораго прыналежалі кабеты і старые, бо уся маладзеж узята на вайну. Арэштавана 150, шмат пакалечэна, у тым ліку паліцэйцы.

**Анэксія Бэльгіі.** «Бирж. Вѣд.» падаюць, што па ўсей Бэльгіі разлеплены абвесткі аб тым, што бэльгія прылучаецца да Нямеччыны.

# Аб усім па троху.

**Гасударственны даход на 1915 г.** Паводле загадзя зробленаго зліку міністэрствам фінансоў, даходы гасударственные у 1915 г. с прычыны спыну прадажы гарэлкі зменшуцца на 430 мільёноў руб.

**Фальшывые грошы.** У апошніе часы у Петраградзкі аддзел Гас. Банку паступіло колькі бумажак 25-ці і 100 рублёвых, каторые прызнаны за фальшывые. Кажуць, што бумажкі гэты былі прывезены с Прыбалтыйскаго краю і дадзены былі яны нямецкімі аддзеламі пры расплаце за харчы. «Гол. Масквы» думае, што яны пушчэны у ход з загаду нямецкаго правіцельства.

**Перэсяленьне у Сібір.** Ад пачатку году прайшло праз Чэлябінск у Сібір 12,893 перэсяленцоў і 319 хадакоў, а вярнулося—4,446 перэсяленцоў і 1,222 хадакі.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

Выйшла з друку новая кніжка, апаведаньне.

**СТРАЖНІК.**

**Сьцёпкі Бірыло.**

32 страніцы — цэна 10 кап.

**Выдавецтво «Беларускаго Выдавецкаго Таварысва у Вільні»**

Вільня, Завальная 7. «Беларуская Кнігарня.

**У горадзі ПОЛАЦКУ новоаткрытая**

**БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ**

**Спаская вуліца дом Бакаева**

СУЛІЦЬ ПОУНЫ ВЫБОР БЕЛАРУСКІХ КНІЖЭК ПРЫЙМАЕ ПАДПІСКУ НА УСЕ БЕЛАРУСКІЕ ЧАСОПІСІ.

Фірма сталася годнай падзякі ЯГО ІМПЕРАТАРСКАГО ВЯЛІЧЭСТВА ГАСУДАРА ІМПЕРАТАРА **12** праўдзівых фотографій толькі **1** р. **50** к. і др. танные цэны —да 21 чэрвеня—Прыдворные Е. В. Ш. П. фотографы **Бр. БУТКОУСКІЕ** конная, 5. Тэл. 375. Высоч. Падар. Падзяка Папы П-я X. 4 зал. мэд. і др. нагр. Вечн. партрэты на фарф. для памятк.

Дозволено военною цензурою.

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.